Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 7 (600). Wilnia, Niadziela 10 Lutaha 1935 h. Hod XI (XIX).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Права ўласнасьці ў абноўленай БХД

(*Артыкул дыскусыйны*).

Дагэтуль у дыскусыйных артыкулах «Бел. Крыніцы» ў справе абнаўленьня праграмы БХД, калі ня лічыць некулькі дужа агульных зацемак у № 35 з 1934 г., цалком ня была парушана праблема ўласнасьці. Тымчасам, здаецца мне, што на гэта нам трэба зьвярнуць паважную ўвагу і ў нашу абноўленую праграму аб уласнасьці ўставіць адпаведныя пункты.

Вось-жа, на гэтым месцы пастараюся выказаць на права ўласнасьці свае пагляды і ўняць іх у канцы ў праграмныя пункты, як гэта рабіў у папярэдніх нумарох „Бел. Крыніцы“ А. Б—ч.

Кожны народ мае часта шмат усякага матар‘яльнага дабра, якім карыстаючыся можа жыць і разьвівацца. Але валаданьне гэтым дабром і карыстаньне можа быць рознае, залежна ад таго, якое для сябе нейкі народ уважае за найлепшае. Гісторыя знае многа спосабаў валаданьня і карыстаньня матар‘яльным дабром у розных народаў, у розных часах. Але як там было даўней, мала нас цікавіць. Нам цікава, як найкарысьней для сябе мае валадаць і карыстаць матар‘яльным дабром наш народ беларускі. Каб даць на гэта пытаньне адказ, хоць збольшага пазнаёмімся з сучаснай у гэтай справе навукай і практыкай.

1. Больш-менш апошніх гадоў сто ў цывілізаваных народаў Зах. Эўропы, агулам бяручы, як у тэорыі, так і ў практыцы, грамадзкі парадак апіраўся на неагранічаным праве прыватнай уласнасьці. Гэта знача, што кожны мог мець рознага дабра (зямлі, фабрык і інш.) на сваю выключную ўласнасьць, сколькі ў яго на гэта хватала грошы, сусім не азіраючыся на патрэбы іншых грамадзян, на дабро агульна-грамадзкае. На грунце гэткага праўна-грамадзкага парадку — хто дужэйшы, той лепшы — выраз капіталізм, грозныя для грамадзянства вынікі якога ў тым, што вобак кучкі вялізарных багатыроў-капіталістых паўсталі многія міліоны залежных ад іх і крыўджаных бедных людзей і поўных пролетараў. Вось-жа сяньня ўжо да капіталізму, як да грамадзкага парадку, дужа несправядлівага і перажыўшага свой век, павароту няма, а гэтым самым няма павароту і да прынцыпу неагранічанага права прыватнай уласнасьці, з якога гэны капіталізм вырас. І сапраўды, людзі сяньня ад капіталізму і зьвязанай з ім неагранічанай прыватнай уласнасьці, уцякаюць і шукаюць новага, справядлівага грамадзкага парадку. Ясная рэч, што і беларускі народ з тым грамадзкім парадкам, які нясе з сабой такое зло, як капіталізм, ня можа мець нічога супольнага.

2. Раз з неагранічанай уласнасьці прыватнай вырастае столькі грамадзкай несправядлівасьці, дык многім здавалася, і яшчэ здаецца сяньня, што для агульнага дабра трэба скасаваць гэту ўласнасьць, завесьці ўласнасьць супольную і на прынцыпе права ўласнасьці супольнай будаваць грамадзкі парадак, парадак грамадзкай роўнасьці і справядлівасьці. Гэткі парадак завялі камуністы ў СССР. Скасавалі яны там, як ведама, усякую прыватную ўласнасьць і зрабілі ўласнасьцяй агульна-грамадзкай ня толькі фабрыкі і двары, але так-жа і сялянскія землі. Словам, паўстала там, сілай заведзеная і сілай трыманая, камуна. Але й пры гэткім грамадзкім парадку да шчасьця народу аказалася дужа далёка. Вышла новая паншчына. Як пры паншчыне даўнейшай чалавек ня меў сваей уласнасьці і волі і працаваў на паноў, так і цяпер у Саветах ня мае чалавек уласнасьці і волі і мусіць працаваць на новага пана, на камуністаў і на іх урад. Пэўне, у народаў дзікіх, бяз ніякай культуры і цывілізацыі, у народаў, якіх можна ўважаць за стаду бараноў, камунізм можа быць сусім добрай формай грамадзкага парадку, але беларускі народ з гэтай прымітыўнай стадыі свайго развою ўжо даўно вышаў і для яго трэба шукаць новых, сучасных, сапраўды справядлівых і спрыяючых яго дабрабыту і далейшаму развою грамадзкага парадку.

3. Сяньня ўжо ведамы ёсьць у навуцы і практыцы іншы кірунак грамадзкага парадку, іншы ад гэных двух папярэдніх, кірунак як-бы між імі пасярэдні. Сутнасьць яго гэткая. Ідучы за патрэбамі і слушнымі склоннасьцямі чалавечай натуры і бяручы пад увагу цывілізацыйныя і культурныя імкненьні сучаснага эўропэйскага чалавека, грамадзкі парадак, агулам кажучы, належа будаваць на прыватнай уласнасьці, але права гэта павінна быць агранічана. Гэта знача, што ўласнасьць прыватная не павінна быць такой абсалютнай і выключнай, каб была шкоднай агульна-грамадзкаму дабрабыту.

Уласнасьць агулам мае падвойны характар: яна павінна служыць ня толькі адзінкам, але й усяму грамадзянству, усяму народу ці дзяржаве. Да ўласнасьці прыватнай павінна належыць тое, што адносіцца да ўжытку адзінак, а да ўласнасьці супольнай, грамадзкай—тое, што адносіцца да агульна-грамадзкага дабра.

Рэгуляваньне правам уласнасьці і яго карыстаньнем, праводжаньне граніцы між уласнасьцяй прыватнай і грамадзкай, а так-жа стараньне аб агульным дабрабыце ўсіх грамадзян належа прадусім да дзяржавы і яго ўрадаў.

Вось-жа гэткая форма грамадзкага парадку сяньня ў Эўропе мае штораз больш староньнікаў і сям-там сапраўды праводзіцца ў жыцьцё. За гэткую больш-менш форму грамадзкага парадку для беларускага народу выказваюся і я.

Вышэй сказанае выражаю ў наступных пунктах, якія прапаную ўставіць у абноўленую праграму нашай арганізацыі.

§ 1. Грамадзкі парадак для беларускага народу агулам павінен апірацца на прынцыпе прыватнай уласнасьці.

§ 2. Прыватная аднак уласнасьць павінна так быць разложана і абстаўлена законам, каб ня была шкоднай агульна-грамадзкаму дабру.

§ 3. Вобак уласнасьці прыватнай можа быць так-жа й уласнасьць супольная (прыватна-грамадзкая, дзяржаўная), дзе гэтага хочуць людзі і дзе гэтага вымагае агульна-грамадзкае дабро.

§ 4. Надзор над уласнасьцяй, як прыватнай, так і грамадзкай, каб яны ня былі шкодныя агульнаму дабру, мае прадусім дзяржава праз свае ўрады, на падставе адпаведных законаў.

Прапаную ўрэшце назваць нашу абноўленую арганізацыю: «Беларуская Нацыянальная Салідарнасьць».

Ц. Д.

Z dziejnaści Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury.

Juški. Wil. Trockaha paw. Hadawaja sprawazdača ad 1.I.34 da 1.I.35. Ahulnaje sabrańnie siabroŭ Hurtka adbyłosia adno, pasiedžańniaŭ Uradu Hurtka — dwa. Adbywalisia časta supolnyja čytańni knižak i hazet. Biblijateka była čynnaja praz uwieś čas. Pračytana bolš 73 knižak. Starańniem sekratara hurtka J. Jarmałkowiča kupleny z Centrali Instytutu 8 značkoŭ i wypisany kamplet „Samapomačy,“ taksama raspradana 25 bieł. adryŭnych kalendaroŭ. Hurtok atrymliwaje 3 časapisy: „Bieł. Krynicu,“ „Chr. Dumku“ i „Šl. Moładzi.“ Prychodu było sa składak siabroŭskich i składak na hazety 19zł. 60 hr., z jakich apłačana za „Samapomač“ 12 zł., za „Bieł. Krynicu“ 4zł. i za „Chr. Dumku“ 2 zł. Za „Bieł. Kr.“ i „Chr. Dumku“ apłaciŭ hr. M. Kitkoŭski. Ahulny lik siabroŭ 11. U skład uradu hurtka wybrany na 1935 hod: staršynia— J. Jarmałkowič, z. w. Juškoŭ, skarbnik — Balesłaŭ Mardas, z zašc. Bierašoŭki, sekratar— Jazep Dulka, z wioski Bigierdaŭ. Kandydaty: 1. hr. M. Kitkoŭski z w. Juškoŭ i 2. Kasper Barkoŭski z w. Juškoŭ. Zahadčyk biblijateki — staršynia hurtka, J. Jarmałkowič. Starańni hurtka zarhanizawać pradstaŭleńnie pad kiraŭnictwam J. Dulki, z pryčyny wialikich pieraškod u 1934 h., nia prywiali da pažadanaha rezultatu, adnak Hurtok pastanawiŭ bolš napružyć siły, kab naładzić pradstaŭleńni ŭ hetym hodzie. Plan pracy na 1935 h. na Ahulnym schodzie ŭstanoŭleny taki: wypisywać bieł. hazety, ładzić teatralnyja pradstaŭleńni, sklikać ahulnyja schody siabroŭ, pry hetym ładzić lekcyi i tawaryskija zborski, tak-ža zaprašać haściej i rabić dyskusii. Pastanoŭlena takža źwiarnuć bolšuju ŭwahu na pašyreńnie biblijateki i datasawańnie jaje da tutejšych warunkaŭ.

в. Белая, Бельскага пав. Ужо тры гады, як у нас існуе гуртох Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры. Залажылі яго людзі, якія мелі на мэце падняць культурны і эканамічны ровень вёскі і ваколіцы. Ад самага пачатку мелі нямала перашкод і труднасьцяў, як з вонкавага так і нутранага боку. Адразу пачалі нам рабіць канкурэнцыю польскія кругі, якія пачалі ў нашай вёсцы закладаць свае „кулкі“. Яны думалі, што іхныя „кулкі“ адцягнуць людзей ад гуртка Інстытуту. Але дарма. Ня гледзячы на тое, што ў нашай вёсцы, дзеля канкурэнцыі з гуртком, было заложана „кулко рольнічэ“, гурток разьвіваўся. Былі выпісаны з Цэнтралі кнігі на закладзіны бібліятэкі і адразу ўпісалася ў сябры гуртка каля 20 чалавек. Здавалася, што труднасьці з вонкавага боку пераможаны і асталося толькі працаваць над падняцьцем культуры і эканомікі ў нашай ваколіцы.

Але тут прыйшлі труднасьці з нутранага боку. Справа ў тым, што ня ўсе сябры былі прыгатаваны да працы на ніве культуры. Маладзяж — гэта ужо паваеннае пакаленьне, а гэтае пакаленьне, ня маючы добрага прыкладу з боку польскіх арганізацыяў, дзе практыкуюцца толькі гульні, пачало рабіць гэтае самае і ў гуртку. Ня было-б нічога дрэннага, каб наша маладзяж зладзіўшы беларускае прадстаўленьне і паказаўшы на сцэне характар беларускай мовы, песьні і культуры, каб потым паскакала сабе на здароўе — гэта сьведчыла-б аб тым, што моладзь наша ўмее лучыць прыемнае з карысным, асабістае з грамадзкім. Гэтак яно і было праз нейкі час.

Але апошнім часам пачало ў нас нешта псавацца. Ня ведаю, якія прычыны маглі выклікаць розныя «перабоі“ ў нашай арганізацыі. Не належачы да гуртка, а толькі чуючы са стараны, я прыходжу да пракананьня, што тут былі роз-

ныя“ прычыны. Магчыма, што ня ўсе сябры былі прыгатаваны, каб спаўняць належна свае высокія абавязкі культурных дзеячоў; магчыма, што ў выпадках, якія мелі месца на Новы Год (па ст. стылю) адыграла ролю маладая кроў, магчыма, так-жа, і тое, што сюды ўмяшаўся нехта варожы, каб справакаваць і ўзарваць нашу арганізацыю знутра. Але мне здаецца, што трэба і тут выдзяржаць і не паддацца пэсымізму, але далей вясьці працу на полі культуры. Трэба добра помніць, што Бел. Інстытут Г. і К. — гэта арганізацыя не масавая—яна ня імкнецца да таго, каб набіраць цэлыя дзесяткі і сотні сяброў, каторыя нічога не рабілі-б, а толькі перашкаджалі-б у рабоце, але яна ідзе да таго, каб весьці *арганізаваную працу на ніве культуры і эканомікі пасярод беларускага народу.* А да такой *арганізаванай* працы на пачатак хваціць трох чалавек. Ясная рэч, што чым болей сьведамых і падгатаваных працаўнікоў, тым лепш, але *на пачатак* хватае і трох, а потым ужо гэтыя трох падгатаўлялі-б памаленьку праз жывое і друкаванае слова новых працаўнікоў.

Дык не падаць духам пад напорам розных нутраных і вонкавых перашкодаў, але ісьці цьвёрдым шагам да азначаных высокіх мэтаў. Гурток у Белай дагэтуль вёў вельмі добра сваю працу і, наскольні помню, быў няраз хвалены Цэнтраляй Інстытуту за сваю дзейнасьць. Гэта ўсё паддае надзею, што і на гэты раз гурток пераможа і вонкавыя і нутраныя труднасьці.

Сусед.

Što heta značyć?

U hetym numary „Bieł. Krynicy“ na inšym miescy my padajom sprawazdaču z dziejnašci hurtka Bieł. Instytutu H. i Kultury ŭ Juškoch, Wil.-Trockaha paw. U hetaj sprawazdačy padadzieny skład nowaha ŭradu hurtka. Woś-ža pawodle abawiazujučych zakonaŭ hety skład uradu hurtka byŭ padadzieny i ŭ Wil.-Trockaje starastwa. Ciapier dawiedwajemsia, što ŭsie padadzienyja siabry ŭradu i ich zastupniki byli wyklikany 20.1. h. h. na pastarunak u Turhieli dziela dopytaŭ. Dapytwali, choć i wietliwa, ale wielmi padrabiazna, stawili šmat roznych pytańniaŭ, pamiž inšym: jak imia baćki i matki, skolki hadoŭ, ci žanaty, i kali žanaty, to skolki dziaciej, ci byŭ sudom karany, jakoj relihii, jakoj narodnašci, skolki ziamli, ci słužyŭ u wojsku, u jakim byŭ pałku abo farmacyi, jakuju tam hodnašć mieŭ i słužbowaje stanowišča, jakuju maje adukacyju i jakuju skončyŭ školu, ci byŭ zahranicaj, jakoje stanowišča zajmaje ŭ hurtku, ci należyć da jakoj partyi i kali należyć, to jakoje tam zajmaje partyjnaje stanowišča i h. d.

Jak bačym, pytańniaŭ cełaja litanija. Paŭstaje pytańnie, našto jany i kamu jany patrebny? Niaŭžo Wil.-Trockaje starastwa maje na mecie hetymi „dopytami“ zastrašyć siabroŭ Instytutu, kab nia jšli ŭ urad? A moža tut zwyčajny kancelaryjny biurakratyzm palicyi? Cikawa, što takija wiestki majem tolki z Wil.-Trockaha pawietu i to ad adnaho hurtka. Ab padobnych praktykach ani z samoj Wilni ani z inšych pawietaŭ nia čuwać.

Dyk što heta maje značyć?

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Гадавы сход „Т-ва Беларускае Каталіцкае Выдавецтва“ ў Вільні. У панядзелак 4 г. м. адбыўся агульны гадавы сход гэтага Т-ва. З справаздачы старшыні Т-ва Кс. Ад. Станкевіча відаць, што Таварыства даволі дзейнае і мае больш 100 сяброў. У мінулым годзе гэнае Т-ва выдала дзьве паважныя кніжкі — „Śledam za Chrystusam“ Тамаша Кэмпійскага (клясычная рэлігійная літаратура), пераклад з лацінскай мовы на беларускую др. Ст. Грынкевіча, і „Hołas Dušy“ — беларускую кніжку да набажэнства, II выданьне, да друку якую прыгатаваў Кс. В. Гадлеўскі. Апрача гэтых дзьвёх кніжак, выданы дзьве брашуры — адбіткі „Chryścijanskaj Dumki“. Т-ва выдае месячны часапіс „Chryścijanskuju Dumku“.

Новы ўрад Т-ва выбраны гэткі: Кс. Ад. Станкевіч — старшыня, Кс. В. Гадлеўскі, Кс. Ст. Глякоўскі, інж. Л. Дубейкаўскі і грам. Ю. Чантарыцкая — сябры ўраду.

Суд. 30 студня сёлета Віленскі Гарадзкі Суд судзіў рэдактара нац-сацыялістычнага часапісу „Новы Шлях“, Ул. Казлоўскага, абвінавачанага ў тым, што ў № 4 (6) свайго часапісу пісаў, што „польскі касьцёл на Беларусі апалячвае беларусаў, а расейская царква — русыфікуе“ і г. д., а так-жа за артыкул, у якім выказана руплівасьць польскіх установаў толькі пра палякаў з крыўдай для беларускай інтэлігенцыі.

Абвінавачаны паказваючы на судзе падставы, на якіх апірае свае цьверджаньні, чытаў з польскай прэсы словы нябошчыка віленскага біскупа Ю. Матулевіча, які ўглядаючыся на полёнізацыю Каталіцкім Касьцёлам ня польскага насельніцтва ў нашым Краю прадсказваў дрэнную будучыню Каталіцкаму Касьцёлу на Беларусі, калі палітыка духоўных уладаў ня зьвернецца на праўдзівую каталіцкую дарогу.

На запытаньне суду, што абвінавачаны скажа ў справе „faworyzowania polaków“ польскімі ўстановамі і праводжаньня польскай работы саюзам коопэратываў „Społem“ — Ул. К. адказаў пытаньнем: „А якую-ж іншую як ня польскую работу мае вясьці польская эканамічная пляцоўка „Społem“? Хіба-ж яна не павядзе беларускай работы...“

Прысуд: 3 тыдні арышту, 100 зл. штрафу і 15 зл. судовых коштаў. Падсудны складае апэляцыю.

У Т-ве Прыяцеляў Беларусаведы пры УСБ. 10.II у VI залі галоўнага ўнівэрсытэцкага будынку адбудзецца зборка Т-ва з рэфэратам мгр. Ст. Станкевіча „Беларускі фольклёрыстычны элемэнт у балядах Міцкевіча“. Пачатак а 17 гадз. Уваход вольны.

З выдавецкае нівы. Выйшлі ў Вільні ў месяцы студні сёлета гэткія часапісы:

„Самапомач“ — беларускі коопэратыўна-гаспадарчы часапіс;

«Шлях Моладзі» — месячны часапіс беларускай моладзі;

„Пралескі“ — месячны беларускі дзіцячы часапіс.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ Ў ЛІТВЕ. Праца і намеры Беларускага Народнага Унівэрсытэту ў Літве. Беларускі Народны Унівэрсытэт у Літве дапаўняе цяпер сваю праграму распрацоўваньнем пытаньняў з галіны гісторыі беларускага народу і яго культуры, малярства, архітэктуры, разьбярства, песьні і музыкі, гістарычнай і эканамічнай географіі Беларусі, гісторыі беларускіх арганізацыяў і г. д. Да апрацоўкі гэтых пытаньняў Бел. Нар. Унівэрсытэт запрашае ўсіх беларускіх культурных работнікаў на варунках даволі выгодных. У пляне працы Унівэрсытэту ёсьць між іншым і выданьне „Бюлетэню працы Унівэрсытэту“. Адрас Унівэрсытэту: Kaunas, Šviesos g-ve № 29.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ Ў ЛАТВІІ. — Дня 27.I сёлета на вучыцельскіх Курсах у Рызе меў адбыцца беларускі рэфэрат В. С., курсанткі і адначасна студэнткі латвійскага унівэрсытэту. Рэфэрат не адбыўся, бо латвійскія ўлады не далі дазволу.

— У суботу, дн. 2.II адбылася ў Рызе, ладжаная беларускай вячэрняй пачаткавай школай, беларуская вечарына, у праграму якой уваходзілі паміж іншым спэктакль і беларускія песьні. Была адыграна камэдыя „Модны Шляхцюк“. На прапяяньне беларускіх песьняў улады не дазволілі. Хор выканаў толькі адну латвійскую песьню — „У чэсьць вольнай Латвіі“(!).

БЕЛАРУСЫ! Падтрымлівайце сваю прэсу. Выпісвайце найстарэйшую беларускую газэту „Беларускую Крыніцу!“

Заданьні грамадзкіх радных.

Новы закон аб самаўрадах — у Польшчы і на нашых беларускіх землях — стварыў новыя самаўрадавыя інстытуцыі — грамадзкія рады.

Праца грамадзкіх радаў, паводле самаўрадавага закону, павінна праводзіцца ў кірунку гаспадарчага і культурна-асьветнага ўзросту данае грамады. Гэты вось закон дае магчымасьць вясковым дзеячом, у гэтай самаўрадавай інстытуцыі — грамадзе, даволі шырокае поле дзеяньня.

Нашая, беларуская, вёска ня толькі бедная, але консэрватыўная — звычаі дзядоў і прадзедаў яшчэ моцна трымаюцца.

Дзеля гэтага і ня мае доступу да нашай вёскі чужынец, дзеля гэтага і ня могуць чужыя нам людзі распачаць ніякай, у гэтым кірунку, працы ў грамадзкіх радах.

Грамадзкія рады астаюцца тэрэнам працы для нашых, беларускіх, вясковых дзеячоў.

Грамадзкія радныя аб працы, прадбачанай законам аб самаўрадах, павінны парупіцца і яе наладзіць.

Працу гэтую трэба праводзіць плянова, памалу, пераходзячы ад малых рэчаў да вялікіх. Прадусім трэба ўпарадкаваць грамадзкую гаспадарку: дзе няма дому — зрабіць народны дом, грамадзкую зямлю — аддаць у арэнду, або прадаць. Словам, павесьці грамадзкую гаспадарку так, каб з яе была карысьць. Трэба, каб каса — грошы — была ў аднаго скарбніка, ня так, як часта бывае, — у Івана, у Сьцяпана і ў Грышкі трошкі, — а як прыдзецца патрэба грошай, то няма ў каго і браць.

Рада, маючы зарганізаваную касу, павінна пастанавіць адкрыць грамадзкую бібліятэку — чытальню і выпісаць у гэтую бібліятэку добрыя газэты і кніжкі — зразумела — беларускія.

Грамадзкая рада павінна заняцца і грамадзкімі дарогамі, якія найчасьцей войты правяць шарваркам у астатку.

Апрача гэтага, трэба зьвярнуць увагу і на гігіену.

У многіх мясьцінах Зах. Беларусі сяляне ня прывыклі мыцца і ня маюць лазьняў — мыюцца ў хаце ў начовачках, цэбрыках, кадушачках. Вось-жа ў гэтых мясьцінах трэба збудаваць грамадзкую лазьню і прывучыць людзей у ёй мыцца.

Гэтак пачаўшы ад малых рэчаў, можна зрабіць у нашай вёсцы вялікія справы для народу і Краю.

Аб гэтым павінна парупіцца і беларуская інтэлігенцыя, што цяпер змушана сядзець па вёсках без адпаведных заняткаў. **К. Мат—віч.**

Wincuk Adważny. 28)

Chłapiec.

POWIEŚĆ.

VI. Dwa chory.

— Nucie, chłopčyki! što-ž wy tak raskiśli? — padhaniaŭ Charašucha swoj chor. — Nu, biarycie ton: „ut, la, fa, ut.“ Dy ty, Pamiałowič, kudy paciahnuŭ, — pad Zawałaku, što?

— Jon nie z Zawałaki, a z samych Smarhoń, — kazaŭ Babinkiewič.

— Nie „z samych Smarhoń,“ a z pad Smarhoń! — papráwiŭ Pamiałowič.

— Adnym słowam, musić Smarhonskuju „Akademiju“ skončyŭ, dyk i ciahnieš, jak miadźwiedź, — kazaŭ Charašucha.

Usie zaśmiajalisia. Śmiajaŭsia i sam pakryŭdžany.

— Nu, chłopcy! jašče prapiajom „Agnus Dei,“ woś jakraz idzie ksiondz wikary, — skazaŭ arhanisty, hlanuŭšy praz wakno. Stali piajać. Ksiondz Hałuza cicha ŭwajšoŭ, staŭ zzadu i słuchaŭ.

— A ty, Pamiałowič, što zapiajaŭ? — zapytaŭsia wikary: — nie piajecca „peckata mundi,“ ale „pekkata mundi.“

— U Smarhoniach usie tak piajuć! — reznuŭ Biabinkiewič.

— Čaho jon da mianie pryčapiŭsia? — žaliŭsia Pamiałowič: — u nas saŭsim nichto nijak nie piaje, bo naš kaścioł zabrany na cerkwu.

Ksiondz nie źwiarnuŭ uwahi na ichnuju sprečku, ale tłumačyŭ dzieciam: „Bačycie, dzieci: słowa „peccata“ značyć „hrachi.“ Woś-ža „Qui tollis peccata mundi“ — značyć „Katory znosiš hrachi świetu.“

— Wot kab pabiełarusku piajać u kaściele, dyk my ŭsio razumieli-b sami! — skazaŭ Albinowič.

— Budzie kališci i pabiełarusku, — moža ŭłaśnie tahdy, jak ty budzieš ksiandzom, — zažartawaŭ wikary.

— Ej, ja nia budu! — adpiraŭsia Albinowič. — Wot, naprykład, budzie ksiandzom Wincuś Jakubionak.

Wincuś ničoha nie adkazaŭ, ale pačyrwanieŭ da samych wušej i tolki ŭ dušy dziwiŭsia, adkul druhija wiedajuć, što jon budzie ksiandzom, kali jon sam ab hetym ničoha nia wiedaŭ?

— Boh wiedaje, chto z was ksiandzom budzie, a chto nia budzie — kazaŭ ksiondz Hałuza. — Ale pa mojemu ksiandzoŭstwa — heta samaje wysokaje pryzwańnie. Wot pahladzicie na wulicu; jak tut ludzi snujuć tudy-siudy. I skolki hetyja biednyja ludzi bjucca — zabiwajucca ad samaj paśledniaj raboty dziela čornaha kuska chleba! Im niama času i padumać ab swajej dušy, a ŭłaśnie ksiondz im heta prypomnić. Jość taksama wielmi mnoha ludziej niaščasnych, pakryŭdžanych, abśmiajanych i zabytych — a ksiondz ich paciešyć. Jany pierad ksiandzom papłačuć, saznajucca z biadoj i z hrachami, paradziacca, pasłuchajuć Božaha słowa i adychodziać wiesialejšyja. Ksiondz — heta prarok, što prapawieduje wiečnaje žyćcio; ksiondz — dochtar, što bačyć samyja śmiarotnyja chwaroby; ksiondz — heta kniaź, uładar dušaŭ ludzkich. Dyk wot, dzieci, kali Boh kaho kliča, tamu treba iści na ksiandza, choć moža časam i nia chočycca. Boh razsiawaje pryzwańnie wielmi husta, tak jak toj biblejny siejbit siejaŭ ziarnio; ale nia kožnaje zierniatka abchodzić. Bywajuć ziarniaty zahłušany hrachami, abo lohkamysnaściaj, abo laniŭstwam. Tahdy taki chłapiec, što nie pasłuchaŭ Božaha hołasu, stanowicca horšym ad druhich. Daru i łaski Božaj marnawać nia možna! —

Chłopcy zadumalisia, a Wincusiu hetaje słowa zapała na samaje dno dušy.

— Nu, chłopcy! — kazaŭ arhanisty: — zaŭtra nie paźniciesia na sumu, bo wy ŭ niadzielu wielmi doŭha śpicio, a pośle dźwie hadziny jaścio bliny.

— Jak z wieraščakaj, dyk trudna skarej źješci, — kazaŭ Babinkiewič?

— Ty siahodnia wielmi wiasioły, — adkazaŭ jamu Charašucha, — zaŭtra musić budzieš płakać.

— A musić budu płakać, — kazaŭ Babinkiewič, — bo, pan, kazaš pryjści ŭ kaścioł, a inspektar prykazwaje iści ŭ carkwu; dyk siadu sierad rynku i budu płakać.

Ty sabie płač, kali chočaš, a ja budu z ciabie śmiajacca i pajdu ŭ kaścioł, — skazaŭ jamu Albinowič.

— I ja ŭ carkwu nie pajdu! — skazaŭ Wincuś.

— Ja taksama nie pajdu, — kazaŭ Babinkiewič, — ale što my zrobim z inspektaram? Swarycca, kryčyć, strašyć: mianie abiacaŭ wyhnać sa školy. Wot užo siahodnia nia pryšli siudy piajać — Łapcinkiewič, Piskun, Łapša, i Cilpionak, — heta značyć, što zaŭtra pojduć u cerkwu. Ja ich znaju!

— Dy niachaj sabie jduć! mnie jakraz Piskuna i Łapšy nia škoda, bo adrakajucca našaj mowy, — skazaŭ Albinowič.

— A ŭ našaj klasie, — kazaŭ staršy wučań, Andrej Jarniewič, — siahodnia inspektar prosta wychodziŭ z siabie: i kryčaŭ, i pławaŭsia i łajaŭ palakoŭ: „Wy, każa, powstancy! wy iditie do lasu“ i h. d. A my to jakija palaki i čaho nam chadzić

Латвійскі дзяржаўны перапіс насельніцтва.

Дня 12.II сёлета адбудзецца ў Латвіі дзяржаўны перапіс насельніцтва. Ён адбываецца што 5-ты год. Паводле апошняга перапісу, што адбыўся 5 год назад, латышы налічылі беларусаў каля 36 тысячаў. Ранейшыя перапісы налічалі беларусаў больш 75 тысячаў. Як бачым, лік беларусаў у Латвіі зьмяншаецца. Але зьмяншаецца толькі паводле перапісаў, бо-ж фактычна лік беларусаў усьцяж узрастае.

Сёлетні перапіс насельніцтва адбудзецца пад знакам узмоцненага тэмпа латышызацыі нацыянальных меншасьцяў у Латвіі, у тым ліку і беларусаў. Латышызацыі спрыяюць і асаблівыя варункі, у якіх перапіс адбываецца (вайсковае палажэньне). У перапішчыкі латышы беларусаў не прыймаюць. Так напр. у Рызе ўсіх беларусаў, што запрапанавалі быць на'т ганаровымі (бясплатнымі) перапішчыкамі і ўжо былі, як такія, запісаўшыся, латыскія нацыяналісты ў перапішчыкі не прынялі. Латвійскі нацыяналізм, — трэба спадзявацца, гэтым разам яшчэ лепш затрыумфуе— але — толькі на паперы!

Дзьвінск. *Задзьвінскі.*

Palityčny dahawor Francyi z Anhlijaj.

Hetymi dniami miž francuskimi i anhielskimi dyplomatami adbywalisia palityčnyja pierahawory. Narady adbywalisia ŭ Londanie. Imi cikawiŭsia ŭsieś palityčny świet. Jany, ci lepš skazać ich wyniki, sapraŭdy cikawyja. Francyja z Anhlijaj dahawarylisia pazwolić Niamieččynie zbroicca, kali jana — Niamieččyna — pojdzie na hutarki ab razbrajeńni.

Pawodle aficyjalnaha pawiedamleńnia ab hetych dahaworach, možna dumać, što Francyja z Anhlijaj buduć iści pa palityčnaj linii hetkaj: — nie abminajučy i Niamieččyny, twaryć pakt dziaržaŭ na zachadzie Eŭropy, jaki pawinien zabieśpiačać, miž inšymi, tak-ža niezaležnaść Aŭstryii i twaryć h. zw. pakt uschodni—na ŭschodzie Eŭropy.

Pastanoŭlena źwiarnucca da Niamieččyny, Belhii i Italii z prapazycyjaj zaklučyć konwencyju awijacyi 5-ci dziaržaŭ: Anhlii, Francyi, Niamieččyny, Belhii i Italii. Kali-ž Niamieččyna admowicca — zaklučyć hety dahawor biez Niamieččyny—4-om dziaržawam.

Z hetaha widać, što Francyja, pry pomačy Anhlii, idzie da zhody z Niamieččynaj. Zahraničnyja hazety pišuć, što treba čakać dahaworaŭ miž Francyjaj, Anhlijaj i Niamieččynaj.

Ab polskaj zahraničnaj palitycy.

U minułym tydni polski ministr zahraničnych spraŭ Bek, u sojmawaj kamisii zahraničnych spraŭ, raskazwaŭ ab polskaj, aficyjalnaj, zahraničnaj palitycy.

Pačaŭ jon swaju pramowu ab adnosinach Polščy z susiedziami — hałoŭna z Sawietami i Niamieččynaj.

Z Sawietami Polšč zaklučyła roznyja dahawory. Jany dali polska-sawieckamu susiedztwu nowuju dobruju formu. Idzie ciapier tolki ab toje, kab hetaja nowaja, dobraja forma susiedztwa była stałaj i trywałaj.

Z Niamieččynaj Polšč zaklučyła dahawor 26.I.1934 h. Paśla hetaha dahaworu pačałosia zbližeńnie Polščy z Niamieččynaj. Polska-niamiecki dahawor ničym nie narušyŭ daŭniejšych polskich sajuźnickich suwiaziaŭ z inšymi dziaržawami. Pryjezd u Waršawu madziarskaha premjera Gembeša— kazaŭ min. Bek — byŭ dokazam, što niama nijakich pieraškodaŭ dla dobrych suadnosinaŭ Polščy z Madziaryjaj.

Prypomniŭ min. Bek i ab admowie ŭ Żeniewie wykonwańnia Polščaj mižnarodnaha dahaworu ŭ sprawie acharony nacyjanalnych mienšaściaŭ. Min. Bek kazaŭ, što papiaredni stan u hetaj sprawie „kryŭdziŭ adnačasna polskija intaresy i pačućcio nacyjanalnaj hodnaści".

U sprawie h. zw. uschodniaha paktu, jaki starajecca stwaryć Francyja z Sawietami, — min. Bek skazaŭ, što dla Polščy heta sprawa nie zaachwočwajučaja.

Niechta stawić Polščy zakid — končyŭ hetkimi słowami swaju pramowu min. Bek, — što Polšč nadta małoje prajaŭlaje zacikaŭleńnie dzieła kolektyŭnaj mirnaj pracy. Pa dumcy min. Beka — heta niapraŭda.

Paśla hetaj pramowy adbyłasia ŭ sojmawaj kamisii dyskusija ab sučasnaj polskaj zahraničnaj palitycy.

„Adasabnieńnie Polščy". Pieršy pramaŭlaŭ u dyskusii — ŭ toj-ža kamisii zahr. spraŭ — pradstaŭnik polskaj endecyi, wiedamy wydatny palityk, pas. St Stroński. Jon wystupiŭ z silnaj krytykaj prociŭ ekspoze min. Beka. Pa dumcy pasła Strońskaha, ciapierašniaja polskaja zahraničnaja palityka idzie nieprawilnym šlacham. Heta palityka wiadzie Polšč da nowaha adasabnieńnia ŭ świecie.

„Na ŭschodzie Eŭropy nia budzie supakoju datul, pakul damahańni Ukraincaŭ nia buduć zdawoleny". U dyskusii nad ekspoze min. Beka d-r D. Lewicki, pradstaŭnik Ukrainskaha Klubu ŭ polskim Sojmie, miž inšym skazaŭ — ...„ani Polšč, ani Niamieččyna nia jość i nia buduć adasobnieny, ale musiać być izolawanyja Sawiety. Z izolacyjaj Sawietaŭ, prociŭ jakich usia Eŭropa musić stanuć frontam, wiažuć ukraincy wialikija nadziei.

Na ŭschodzie Eŭropy nia budzie supakoju datul—kazaŭ d-r Lewicki, — pakul nia buduć zdawoleny damahańni Ukraincaŭ,—40 miljonnaha narodu. Ukraincy imknucca da niezaležnaści".

Kanhres sawietaŭ.

Ciapier adbywajecca ŭ Maskwie 7 čarhowy kanhres pradstaŭnikoŭ sawieckich respublikaŭ SSRR. Zadańniem hetaha kanhresu jość — padsumawać rezultaty sawieckaj palityki i wybrać nowy wykanaŭčy kamitet. Źjezd pradstaŭnikoŭ wyjaŭlaje „pačućci" wiernaści dla Stalina i wykazwaje wajennaje samachwalstwa.

Pieršuju i wialikuju pramowu skazaŭ staršynia kanhresu Mołotow. Jon z naciskam padčyrknuŭ ścisłaje supracoŭnictwa Sawietaŭ z Tureččynaj, a ŭ bok Niamieččyny śćwierdziŭ pahoršańnie suadnosinaŭ, pakazwajučy na niamieckija ekspansyŭnyja plany.

Cikawaja taksama była pramowa kamisara abarony, hien. Tuchačewskaha, jaki wykazaŭ zbrajeńni Sawietaŭ.

Sawieckaja armija ŭzrasła ad 600 da 940 tysiač sałdataŭ. Wajskowy budžet, što ŭ 1930 h. byŭ — 1.655 miljonaŭ rubloŭ, dasiahnuŭ u 1934 h. da 5 miljardaŭ rub., a na 1935 hod maje być 6 z paławinaj miljardaŭ. Ad woziera Ładahi da Čornaha Mora prałožany łancuh krepaściaŭ. Tuchačewski paćwiardžajučy ŭzrost prociŭsawieckich sympatyjaŭ, brawurna machnuŭ, byccam na pastrach, što čyrwonaja armija zapeŭniaje pieramohu proletarskaj rewalucyi.

Nieŭdajecca Sawietam i ŭ Amerycy.

Paśla pryznańnia Zł. St. Ameryki Sawietaŭ, balšawiki pačali tam, u Amerycy, šukać pažyčki hrošaj. Zł. Št Ameryki ŭ heny čas šukali sposabu, kab Sawiety zhadzilisia i pačali addawać Amerycy pradwajenny carski doŭh. U hetaj sprawie doŭha hawaryli pradstaŭniki hetych krainaŭ i woś ciapier pradstaŭniki Zł. Št. Ameryki wykazali, što amerykanski ŭrad Sawietam pažyčki nia daść.

Balšawiki, reč jasnaja, spłačywać carskich daŭhoŭ nia buduć.

U Litoŭcaŭ.

Nacyjanalnaje świata. 16.II prypadajuć 17-tyja ŭhodki litoŭskaj niezaležnaści. Wilenskija litoŭcy, za prykładam minułych hadoŭ, užo rychtujucca da naležnaha ŭšanawańnia hetaha wialikaha swajho nacyjanalnaha świata.

Kanfiskata. Zahadam Starasty na m. Wilniu skanfiskawany Nr. 10 „Vil. Rytojus" za adozwu Litoŭskaha Tymčasowaha Nacyjanalnaha K-tu pad zahałoŭkam „Da swajho hramadzianstwa".

Pakarany litoŭski probaršč. Ks. B. Krištopanis, probaršč u Haduciškach, 22.I pakarany Świancianskim Starastwam na 500 zał., abo na dwa tydni aryštu, za toje, što jon 9.X min. hodu ŭ swaim kaściele adprawiŭ žałobnaje nabaženstwa. Da hetaha pryčyniŭsia kamandant palicyi, pawodle jakoha nabaženstwa hena mieła asabliwyja mety.

Pakryŭdžany sprawu škirawaŭ u Sud. Cikawa, ci Sud ubača henyja „asabliwyja mety" ŭ nabaženstwie litoŭskaha probaršča, ci nie?!

Ahulny hadawy schod siabroŭ T-wa św. Kazimiera adbyŭsia ŭ kancy minułaha miesiaca, na jakim była zroblena sprawazdača z dziejnaści T-wa za minuły hod, razhledžany mnohija wažnyja sprawy i wybrany nowy ŭrad.

Wiečar T-wa Ćwiarozaści adbyŭsia 2.II u zali Litoŭskaj Himnazii, na jakim byŭ referat ab škodnaści alkaholu dla zdaroŭja. Pa referacie była adyhrana na scenie drama „U krainie biazdońnia".

Žadajuć wyjaśnieńnia sprawy hoładu ŭ Sawietach.

Mižnarodnyja i mižwyznaniowyja kamitety pomačy haładajučamu nasielnictwu ŭ Sawietach — u Wienie i ŭ Żeniewie — razasłali na dzień 5 lutaha sioleta wa ŭsie hazety supolny zaklik, u jakim, u imia lubowi bližniaha i biaz uwahi na roźnicy rasawyja i prakanańni, damahajucca prad usim świetam ad sawieckaha ŭradu wyjaśnieńnia, jak sapraŭdy pradstaŭlajecca ŭ ich sprawa wyžyŭleńnia. Krok swoj tłumačać nazwanyja kamitety tym, što pawodle wieryhodnych wiestak trecich asob, a taksama i aficyjalnych sawieckich dekretaŭ, napr. z dnia 26 śnieźnia 1934 h., u ziemlarobskich wakruhach sawieckaha sajuzu ŭznoŭ naśpiawaje hoład, nia mienšy, a moža nawat i bolšy ad taho, jaki panawaŭ tam u 1933 hodzie. Zahraničnyja padarožniki, što adwiedwali sawieckija krai, śćwiardžajuć, što ŭradžai ŭ mnohich miascoch SSSR, z pryčyny suchaści, naahuł prapali. A što dzie i astałosia, dyk sawieckija ŭłady paadbirali ad sialan pierad usim dla wojska, fabryčnych rabotnikaŭ i dla ŭprywilejawanych ludziej (partyjnych kamunistaŭ). Sialanie-ž, asabliwa tyja z ich, što dahetul nie pajšli jšče „dabrawolna" ŭ kałhasy, prosta nia majuć čym prakarmicca i im pahražaje hoład.

Zaklik hety ad imia wienskaha (Aŭstryja) Kamitetu padpisaŭ tamašni kardynał ks. Dr. T. Innitzer; ad imia żenieŭskaha (Świajcaryja) Kamitetu — praf. E. Choisy i ad imia žydoŭskaha Kamitetu ŭ Wienie (Aŭstryja) — hałoŭny rabin Dr. D. Feuchtwang.

„do lasu"? Prosta, zdurnieŭ čaławiek! Ja nia wiedaju, jak tam chto, ale ja sam — biełarus. Dy i ŭsie tut takija, jak ja: my ŭsie pa-prostu haworym i wychodzim z prostych baćkoŭ. Praŭda, niekatoryja z nas užo pačynajuć stydacca rodnaj mowy, ale ja widžu, što heta chłopcy durniejšyja, i wot jakraz dwa takija chodziać u cerkwu. Paśle niejak inspektar uspakoiŭsia i pačaŭ tłumačyć łahodnym tonam i kazaŭ: „Cerkwa na waša katalictwa, kaža, nie zaškodzić, bo wot piajaŭ kaliści ŭ mianie ŭ cerkwie wučań Zarecki, a ciapier jon staŭ ksiandzom." My ŭsie maŭčym, a inspektar to złujecca, to adchodzić i spakajnieje, a ŭsio k'sabie ciahnie! Dyk što nam rabić?

— Bačycie, maje dzieci,—prahawaryŭ ksiondz Hałuza, katory dasiul maŭčaŭ i słuchaŭ chłapcoŭskija apowieści: bačycie, što tut pačynajecca sprawa pawažnaja, tut žartawać nia možna. Treba nam usio abdumać i pastanawić, a tahdy ćwiorda trymacca. Pieradusim wy śmieła składajcie ŭsim adkaznaść i winu na mianie, a ja ŭžo patraplu z inspektaram hawaryć.

— Nie, my hetaha nia zrobim, — kazaŭ Albinowič, — bo samomu ksiandzu budzie drenna.

— A što budzie? — pytaŭsia Wincuś.

— Budzie štraf, abo turma, abo i aboje razam,—abjaśniŭ Jarniewič: — ja heta wiedaju, bo i naš probaršč u Krucewičach zapłaciŭ sto rubloŭ (zołatam) štrafu, a paśle cely hod byŭ biaz miejsca, zatoje, što achryściŭ dzicia patajnych katalikoŭ.

— Turmy to moža j nia budzie, ale budzie klaštar, — tłumačyŭ wikary.

— Jaki klaštar, što heta takoje? — iznoŭ aśmieliŭsia zapytacca Wincuś.

— Klaštar—heta samo pa sabie dzieła światoje, — kazaŭ ksiondz wikary. — Tolki-ž u Rasiei ciapier farmalnych klaštaraŭ niama: astalisia tolki ścieny—mury, a manachaŭ rasiejcy razahnali. Carski ŭrad pakinuŭ pa adnym klaštary ŭ kožnaj hubernii i tudy žandary pierawiaźli starych manachaŭ. Nowych pryjmać nia možna, a staryja mohuć tam sabie spakojna ŭmirać. Ciapier i ŭ nas jość takoje adno miejsca, hdzie ŭžo staryja manachi wymierli, ale nazowa „klaštar" astałasia: tudy ŭłaśnie ŭrad pasyłaje winawatych ksiandzoŭ, kab tam sabie siadzieli biez raboty i tak pakutawali. Woś i ja spadziajusia tudy papaści na hod ci na dwa hadočki, bo takich „uradowych" hrachoŭ možna znajści i ŭ mianie. Usie my winawaty pierad uradam chacia-by zatoje, što my—ksiandzy.

—A za što takaja kara?—pytaŭsia Babinkiewič.— Ci my ŭ carkwie piajom, ci nie piajom, kamu tut biada? I takaja tam u carkwie wažnaja malitwa: „Paki, paki, daj tabaki! Cha, cha, cha!"

— Čuješ, chłapiec, ścichni, pakul ja nie razhniewaŭsia!—kazaŭ ksiondz Hałuza: — śmiaješsia nad tym, čaho sam nie razumiaješ. Sławianskaja mowa — heta mowa pawažnaja, staraja, i jana — matka takža j dla našaj mowy biełaruskaj. Nam jana wielmi blizkaja jašče i tym, što pa-sławiansku malilisia našy dziady — pradziedy, jak byli ŭnijatami. Paśle carskaja Rasieja ŭsio heta zhłumiła i raździaliła naš narod na dwa warožyja abozy. Kamu z hetaha karyść? Wiedama, nikomu! Wiečnyja wojny zajadajuć Rasieju i Polšč, a ŭsio heta za Biełaruś. Kab my byliświedamyja biełarusy, dyk my abo sami ŭstroili-b swaju niezaležnaść, abo złučylisia-b, z kim zachacieli-b, i nam tahdy było-by dobra, bo my byli-b roŭnapraŭnymi i poŭnapraŭnymi. A tak...

— Ale ja pačaŭ hawaryć ab carkwie, — kazaŭ, padumaŭšy, ksiondz Hałuza: — woś nabaženstwa ŭ carkwie wielmi pryhožaje i dla nas zrazumiełaje. Jak heta kaliści było dobra, jak unijaty i kataliki byli za adno! razam chadzili ŭ carkwu i ŭ kaścioł, razam malilisia, i nichto im nie pierečyŭ, bo tahdy była adna wiera.

Jano i ciapier pawinna być hetak sama. Ale biada ŭ tym, što rasiejskija cary našu carkwu adarwali ad Rymu ŭ 1839 hodzie i jana ciapier jak-by žywy sučok adarwany ad žywoha pnia. I z hetaj niažywoj hałuzy Rasieja choča zrabić žywoje drewa. Wiedama, daremny trud! tolki tracicca naprasna čas i siła. Kab hetaja adłučanaja Carkwa abapiorłasia jznoŭ na Piatrowaj Skale i wiarnułasia pad pasłušenstwa Naśledniku Piatrowu ŭ Rymie dyk tahdy i da jaje tasawalisia-b słowy Chrysta, „Bramy piakielnyja nie pieramohuć jaje." A tak...:

— A tak — pieramohuć! — skazaŭ Jarniewič.

— Nu, jašče Rasieja krepkaja, — hawaryŭ ksiondz Hałuza: — woś Rasieja prawasłaŭnuju wieru i dziaržyć. Biez padmohi rasiejskaha haspadarstwa cerkwa sama astoicca nia moža. Ab hetym zrešta budziem hawaryć u škole na lekcyjach kaścielnaj historyi.

— Ale praŭda pieramoža, — kazaŭ Albinowič, — dyk usioroŭna pieramoža katalicki kaścioł: kaścioł zapanuje na całym świecie!

— Jano to tak, — tłumačyŭ ksiondz Hałuza: — u kancy katalicki kaścioł abojmie cełу świet i „budzie adzin pastyr i adna stada. Ale my možam hetaha nie dačakacca.

— A ci moh-by kaścioł zahinuć saŭsim? — spytaŭsia Wincuś.

— Nie, heta niemahčyma; jak nie mahła patanuć taja łodka, u katoraj byŭ Pan Jezus, choć i spaŭ i choć bura pahražała, a ŭsie apostały bajalisia strašenna.

Roznyja wiestki.

Z UKRAINSKAHA ŽYĆCIA.

Ukrainskaja mowa ŭ Prawasłaŭnaj Carkwie na Wałyni. Hetymi dniami adbyŭsia ŭ Kremiancy źjezd Wałynskaj eparchii Prawasłaŭnaj Carkwy. Źjezd pastanawiŭ uwieści ukrainskuju mowu ŭ prawasłaŭnyja cerkwy na Wałyni, u propawiedziach i ŭ bahasłužeńni.

Z POLŠČY.

Pamior B. Limanowski. Dnia 1 h. m. pamior u Waršawie na 100 hodu žyćcia zakładčyk polskaha marksaŭskaha socyjalizmu wydatny socyjoloh i publicyst — Balesłaŭ Limanoŭski.

Iznoŭ danina. U „Dzienniku Zakonaŭ" abwieščana rasparadžeńnie ministra skarbu ŭ sprawie abličeńnia i zyskiwańnia nadzwyčajnaj daniny ad majemaści na 1935 hod.

Zaraz pačnuć brać zalički hetaj daniny.

Razłom u polskaj ludowaj partyi. U polskaj partyi „Stronnictwo Ludowe", jakaja paŭstała z abjednańnia troch partyjaŭ — „Piast", „Wyzwolenie" i „Stronnictwo Chłopskie", wystupiła 11 pasłoŭ.

Polskija sialanskija partyi nia mohuć znajści supolnaha šlachu baraćby za lepšuju dolu polskaha sialanstwa.

Z ZAHRANICY.

Druhaja hadaŭščyna ŭłady Hitlera ŭ Niamieččynie. 30 studzienia sioleta wa ŭsiej Niamieččynie wielmi ŭračysta światkawali druhuju hadaŭščynu ŭłady nac-socyjalistaŭ. Z fondu „zimowaj dapamohi" razdana ŭ hety dzień 20 miljonaŭ marak zapamohi dla najbiadniejšych.

Balšawicki „samodieržec". Hazety padajuć: adnojčy źjawiłasia da Stalina delehacyja rabotnikaŭ maskoŭskich fabrykaŭ i ŭ hutarcy z dyktataram, delehacyja žaliłasia na niedachwat ježy. Stalin wysłuchaŭšy žali rabotnikaŭ zajawiŭ — „Dziele taho tolki, što wy baiciosia padochnuć z hoładu, ja maju wiarnuć wolny handal i prywatnuju ŭłasnaść. Hetaha nie dačakajecie! Zdochniecie z hoładu wy, zdochnu ja z wami, ale kamunistyčny ład u Rasiei astaniecca".

Na pasiedžańni politbiura adzin z siabroŭ skazaŭ, što z pryčyny wywozu zbožža zahranicu ŭ niekatorych wokruhach Rasiei pahražaje hoład. Stalin adkazaŭ: — „Dla nas ważniej dziesiać-dwaccać mašyn, jakija nabudziem za pradanaje zbožža, čymsia žyćcio dziesiaci-dwaccaci tysiač sialan, što pamruć z hoładu".

Pamior pamocnik Stalina. U Maskwie nahła pamior zastupnik staršyni narodnych kamisaraŭ Kujbyšew. Niekatoryja hazety pišuć, što Kujbyšewa prystrelili.

Śpieka ŭ Arhientynie. Ciapier u Arhientynie haračynia dachodzić da 42 hradusaŭ.

Z KRAJU.

Niabywałyja śniahi. U wołaści Rakaŭskaj, Maładečanskaha paw., apaŭšy anahdaj śnieh pakryŭ pali i darohi tak, što słoj śniehu siahaje 2-ch metraŭ.

Пісьмы з вёскі.

Цяжка жывецца ў нас на хутарах.

Бурачкі,—Заельня,Нясьвіскага пав. Цяжка стала жыць у нас на хутарах. Здаецца няма ў нас ні п'яніцаў, ні карцёжнікаў—усе зборлівыя, цьвярозыя, працавітыя, аднак галыцьба хоць ты жывы ў зямлю лезь.

Працуем, як той казаў, ад зары да зары, стараемся, каб нічога ў гаспадарцы не прапала, а здарыцца на пільную патрэбу які небудзь злот пазычыць, дык абегаеш усе хутары і з пустымі рукамі вернешся да хаты. Словам, бяда і гора ня вылазяць з нашых хатаў.

Час-ад-часу нас пацяшаюць, што скора крызыс скончыцца, цэны прадуктаў сялянскай гаспадаркі пойдуць угару, а тагды сялянства разбагацее і будзе ўсім добра. Мы гэтым абяцанкам ня верым, бо гавораць пра гэта нам ужо даўно. Пакуль гэтае сонца ўзыйдзе, дык раса нам вочы выядаець — ня ведаеш, як адцерабіцца ад сэквэстратараў і іншых „дабрадзеяў". Жывём каля лесу, а веніка ў хату, мятлу ў гумно, трэба купіць, бо слугі кн. Радзівіла за кожны дубчык караюць штрафамі ды судамі; з апалам таксама трудна.

З прычыны праведзенай у нас камасацыі і мэліёрацыі, маем такое множства розных даўгоў і забавязаньняў, што бацькі сумляваюцца, ці здолеюць і іхнія дзеці а на'т і ўнукі выплаціць гэтыя даўгі. Ня гэтак даўно клікалі нашых сялян у валасьць і доўга гаварылі аб вялікіх палёгках ды „боніфікацыях", і сказалі, што ў 1935 годзе трэба будзе плаціць усе падаткі і даўгі — казённыя і прыватныя.

Шмат хто з нашага сялянства, пры сваей гаспадарцы, займаецца рамяслом — кавалі, краўцы, шаўцы і г. д. Цяпер гэтым рамесьнікам наказалі браць патэнты. Цісьне нас зямельны голад; хутаркі маем невялікія, па 5—6 гэкт. Цяпер гэтыя хутаркі ўжо дзеляцца на 7—8 частачак, і йзноў паяўляюцца вузенькія шнуркі. Хлебароб.

Прасьвячаймася!

Сімакова, Стаўпецкага пав. Дзе бедната, там і цемната. Дзе цемната, там і бедната! Словам, гэта бывае найчасьцей разам. Вось у нас народ бедны, але адначасна ён і цёмны. Я пэўны, каб наш народ быў сьвятлейшы, то быў-бы і багацейшы. З боку гледзячы на некультурныя паступкі нашых людзей — сьмех і жаль бярэ.

Вось абразок з жыцьця нашай моладзі. На Каляды ладзіла моладзь ігрышча. Без гарэлкі не абышлося. Хлопцы панапіваліся і выглядалі ў скоках, як дзікары. Дзяўчаты гарэлкі ня п'юць. Нашыя дзяўчаткі прыгожыя, але яны недзе чулі і бачылі, што гарадзкія жанчыны малююць сабе твар рознымі хварбамі, каб быць харашэйшымі,— на ігрышча і яны абмазаліся гэтай жаночай гарадзкой мазяй. Ну і ўсе былі, як бязхвостыя малпы.

Дарагая моладзь, ня ўсё прымай з сучаснай мяшчанскай культуры. Каб Ты, моладзь, адрожніць магла гарадзкое гнільлё ад карысных здабыткаў культуры, чытай добрыя кніжкі і газэты. Прыглядайся і прыслухоўвайся, як ладзіць вечарыны беларуская моладзь у другіх мясцох, — дзе ёсьць беларускія арганізацыі. Аб гэтым можна даведацца з беларускай газэты „Б. Крыніца".

Словам, прасьвячайся моладзь, бо йнакш з бядой узяць разлуку трудна. Я. Ал.

Što rabić, kab dachodzili hazety?

Z mnohich kutkoŭ našaha kraju prychodziać wiestki ab niedaručańni „Bieł. Krynicy" i ahułam biełaruskich hazet. Najbolš ludzi skaržacca, što pošty addajuć hazety ŭ wołaść, wołaść sołtysam i h. d., i rezultat taki, što hazety ŭ darozie hinuć. Zaradzić złu možna dwajakim sposabam: abo naniać na pošcie paštowuju skrynku (za jaje treba płacić), abo paprasić kaho z miascowych, dzie jość pošta, kab na jaho možna było adrasawać hazety i inšyja druki. Čytačy swaju poštu zabirali-b hetak sami. Hety, apošni, sposab wyhadniejšy dla tych, chto nia moža apłacić za paštowuju skrynku.

Dyk prysyłajcie adrasy hetkich znajomych blizka kala pošty, katoryja mohuć i zhadžajucca atrymliwać z pošty Wašu i swaju razam karespandencyju. Hetkim paradkam možna abminuć niaprošanych kantraloraŭ i nia dać hinuć hazetam.

Administracyja „B. Krynicy".

Ужо вышла з друку першая кніжка беларускага літаратурна-навуковага часапісу

„КАЛОСЬСЯ".

Часапіс абыймае 72 бачыны вялікага фармату і зьмяшчае ў сабе наступныя літаратурныя творы й навуковыя артыкулы:

1. Н. Арсеньнева: „Як калосьсе ў жытняй ніве," „Новая зіма," „Завея," „Неўгаданая," „Калі на захадзе зьнікае."(Вершы). 2. М. Машара: „На пералом," „Я хачу, каб ты сьпявала," „Мне хочацца сёньня расчуліцца," „Пад акном, пад парканам бярозка," „Так-бы вербай стаяць," „Наўкол так прыгожа," „Новаму Году," „Ліст." (Вершы) і „Асеньняй ноччу" (Апавяданьне). 3. Хв. Ільляшэвіч: „Я ня знаю," „Лягчэйшы ўздох." (Вершы). 4. М. Дальны: „На дарогу" (Апавяданьне). 5. А. Бярозка: „Сьнягі, сьнягі," „Туман разаслаўся" (Вершы). 6. Г. Вялецкі: „Гэта было так нядаўна" (Верш). 7. П. Трус. „Ой, люблю," „У Купальскую ноч," „Не на ўзмор'і чаўны," „Асеньняе" (Вершы). 8. М. Зарэцкі: „Радасьць" (Апавяданьне). 9. Я. Шутовіч: „Адам Гурыновіч," „З недрукаванай спадчыны Гурыновіча." 10. Ад. Станкевіч: „Mužyckaja Praŭda" і „Гоман." 11. Ст. Грынкевіч: „Культура й загады грамадзкае працы." 12. Др Я. Станкевіч: „Севяране — беларускае племя." 13. А. Клімовіч: „Апошнія гады паншчыны на Беларусі." 14. Кнігапіс—рэцэнзіі літаратурных твораў і навуковых працаў. 15. З жалобнае карты і 16. „Культурная Хроніка."

„Калосьсе" павінна быць настольным часапісам кожнага беларуса, кожнае беларускае ўстановы і арганізацыі!

Выпісываць можна з Рэдакцыі (Адрас: Вільня, Завальная вул. 1—3).

Падпіска на год—4 зал., на паўгода—2 зал. Адна кніжка—1зл.

Пробныя нумары ані ўдоўг высылацца ня будуць!

Рэдакцыя і выдавецтва „КАЛОСЬСЯ".

Dr. Stanisłaŭ i dr. Jadwiha Hrynkiewičy.

Suchoty (Tuberkuloza).

Usie ludzi wiedajuć, što suchoty—heta chwaroba nadta *niebiaśpiečnaja i zaraźliwaja.* Wyklikajuć ich bakteryi, jakich možna bačyć tolki pad mikraskopam. Čaławiek chwareje na suchoty tolki tady, kali da jahonaha arhanizmu łučać henyja bakteryi i tam pačnuć razmnažacca. Usie orhany cieła mohuć być zaražany suchotami: załozy — lohkija, mozah, strawatraŭčyja orhany, kości, sustawy, skura.

Najbolš niebiaśpiečnym dziela asiarodzišča źjaŭlajecca čaławiek, jaki maje suchoty ŭ *lohkich.* Čaławiek taki adcharkiwaje z chworych lohkich flehmu, u jakoj *znachodziacca* šmatlikija bakteryi suchotaŭ. Mohuć jany znachodzicca taksama ŭ kale i mačy suchotnikaŭ, kali tyja majuć suchoty nyrak abo strawatraŭčaha orhanu.

Apračа čaławieka, mohuć chwareć na suchoty žywioły, z pamiž jakich ważna nam wiedać, što chwarejuć *karowy.* Bakteryi suchotaŭ znachodziacca tady ŭ małaku, maśle, syry, miasie ad karowy chworaje na suchoty. Bakteryi ad hetkich karowaŭ wyklikajuć suchoty j u ludziej.

Jak pašyrajucca suchoty: 1) čaławiek chwory na suchoty amal što nie zaŭsiody kašlaje. Z kašlam raspyrskiwajucca sploŭki na drobnieńkija častki-kapli. Kali ŭ susiedztwie znachodzicca čaławiek zdarowy i ŭdychaje henyja kapielki sploŭkaŭ, tady zaražajecca.

Zarazicca suchotami možna i tady, kali sploŭki suchotnika znachodziacca na padłozie, na ścienach, na chatniaj abstanoŭcy, na paścieli abo na nasatcy. Sploŭki wysychajuć i razam z pyłam mohuć łučyć u pawietra. Zamiatajučy chatu na sucha, heta značycca nie pasypaŭšy padłohi mokrym piławieńniem, čaławiek zdarowy ŭdychaje heny pył i zaražajecca. Dzieci, poŭzajučy pa padłozie, mohuć papeckanymi pyłam ručkami zarazicca suchotami, kładučy ručki ŭ rocik.

2). Nia tolki praz orhany dychańnia čaławiek zaražajecca suchotami, ale i cieraz straŭnik. Jak wyšej skazana, małočnyja pradukty karowy chworaje na suchoty wyklikajuć u ludziej suchoty. Taksama zaražaje karystańnie supolnym načyńniem z suchotnikami, dziela taho, što na jom mohuć być śłady ichnich sploŭkaŭ. Caławańnie ŭ huby suchotnikaŭ, padawańnie ruki, jakoj moh suchotnik abcirać sabie rot, — moža być pryčynaju zaražeńnia.

3). Kali bakteryi suchotaŭ traplajuć da ranaŭ na skury, wyklikajuć jany tady suchoty skury, jakija zawucca *waŭčankaju.*

Suchoty ŭ dziaciej. Dzieci zaražajucca tak, jak i darosłyja, šlacham *orhanaŭ dychańnia i cieraz straŭnik.* U dziaciej zaražanych suchotami wystupajuć najčaściej h. zw. *skrofuły* u załozach na šyi pad skiwicami, dalej *suchoty ŭ kaściach,* jakija mohuć wyklikać horb, ci suchoty *mozahu i jahonych bałonaŭ,* što prajaŭlajecca *meninhitam,* jaki kančajecca amal nie zaŭsiody błaha, dziela taho, što dzicia pamiraje.

Roznajaki moža być zychod zaražeńnia suchotami ŭ dziaciej. Bakteryi suchotaŭ, traplajučy da lohkich, pierachodziać da limfatyčnych žyłaŭ i da lohačnych załozaŭ. U ich pačynajuć jany razmnažacca, raźjadajuć załozy a nat' lohačnuju tkaninu i nadta chutka wiaduć da śmierci.

Moža być i inšy zychod zaražeńnia ŭ dziaciej. Bakteryi słaba razmnažajucca, nie raźjadajuć akružajučaje ich tkaniny lohkich, a nawakoła asiedlišča bakteryjaŭ wydzialajecca *ścienka z wapna,* jakaja adharodžywaje zaražanaje miesca ad zdarowaha. U taki sposab miecimiem *skrytyja suchoty.* Kali dzicia adpornaje, dobra jeść, u chacie maje čyściniu i paradak, šmat słonka i dobraha pawietra, suchoty skrytyja nia buduć pašyracca i z dziciaci wyraście čaławiek zusim zdarowy.

Inšaja sprawa, kali dziciačy arhanizm apynicca ŭ kiepskich umowach žyćciowych: maje kiepskuju ježu, ciomnaje i wohkaje pamieškańnie, prykładam niedzie ŭ padziamielli, u jahonaj siamji chwareje niechta na suchoty, dzicia pierapracujecca, u izbie śpić šmat ludziej abo dzicia śpić z baćkami ŭ adnym łožku — heta usio buduć mamenty, jakija robiać arhanizm dziciačy *niadužym i nieadpornym.*

U takoha dziciaci „zamurowanyja" bakteryi nabirajuć siłaŭ i kidajučyś na asłabieŭšy dziciačy arhanizm wyklikajuć hetak zwanaje *samazaražeńnie.*

Moža być, što dzicia majučy skrytyja suchoty zarazicca paŭtorna zwonku. Chacia ŭ pieršy raz suchoty ŭ jaho spyniliś, kali dzicia było dužejšaje, paŭtornaje zaražeńnie wykliča suchoty. Henyja suchoty moža lekar lohka paznać. Najčaściej jany prajaŭlajucca ŭ lohkich, kaściach i h. d.

U dziaciej, jakija pierachwareli na wadzior, kokluš ci inšuju wostruju dziciačuju chwarobu, paśla jakoje astaŭsia kašal, ci ahułam dzicia nadta mocna abniadužała i chutka nie papraŭlajecca, treba dumać ab mahčymaści zaražeńnia suchotami.

Pahlad ludziej, byccam suchotaŭ niemahčyma wylekawać, uziaŭ swoj pačatak u tym, što ludzi źwiartajuć na ich uwahu i pačynajuć lekawacca, kali ŭžo lišnie pozna.

Zmahańnie z suchotami pawinna pačynacca ad najmienšych hadoŭ dziciaci. Treba hadawać dzicia ŭ zdarowym asiarodziščy, nie dawać spatykacca z chworymi na suchoty i dobra im dawać jeść, adnačasna nie škadujučy im słonka, pawietra i sporataŭ (himnastyki)— u taki sposab budzie što raz mienš umirać ad suchotaŭ.

Redaktar Jan Paźniak. Bielaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 3. Wydawiec A. Šutowič